Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
«Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі»

# На радзіму герояў

*Праект краязнаўчага маршрута № 3*

Укладальнік – педагог дадатковай адукацыі Вайцяховіч А.В., кіраўнік аб’яднання па інтарэсах “Турызм”

# *На радзіму герояў*

### ***Праект краязнаўчага маршрута***

Докшыцкая зямля – гэта край, дзе шануюць памяць сваіх землякоў, загінуўшых у баях за Радзіму. Тысячы нашых землякоў у складзе Чырвонай Арміі, партызанскіх атрадаў і падполля прайшлі цяжкімі шляхамі Вялікай Айчыннай вайны. Яны ўнеслі важкі ўклад у разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў і набліжэння вялікай Перамогі. Аб іх подзвігу пераканаўча сведчаць шматлікія баявыя ўзнагароды – ордэны і медалі. Ранняй вясной і позняй восенню цвітуць кветкі на брацкіх магілах, каля помнікаў і абеліскаў.

Пяць Герояў Савецкага Саюза нарадзілася на Докшыцкай зямлі: Сцяпан Сцяпанавіч Манковіч, Арсенцій Гаўрылавіч Юхнавец, Аляксандр Іванавіч Чэрныш, Франц Іосіфавіч Перхаровіч, Уладзімір Ігнатавіч Стрэльчанка. Сваімі подзвігамі яны паказалі прыклады гераізму, невычэрпнай любві да Радзімы і нянавісці да фашысцкіх захопнікаў. І дзе б не праходзіў іх баявы шлях – у авіяцыі, пяхоце, артылерыі ці партызанскай брыгадзе – усе іх мары былі звязаны з хутчэйшым вызваленнем роднай бацькаўшчыны.

Праходзяць гады, дзесяцігоддзі…

А мы павінны ведаць землякоў, якія ўдзельнічалі ў самай кровапралітнай, жорсткай і цяжкай вайне, якія аддалі самае дарагое – сваё жыццё, якія вярнуліся дадому пераможцамі.

Паход II ступені складанасці “На радзіму Герояў” ставіць перад сабой мэту: вывучэнне і даследаванне гераічнага мінулага нашых землякоў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Ён разлічаны на дзяцей сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту.

# Тлумачальная запіска

Адпраўным пунктам нашага падарожжа з’яўляецца горад Докшыцы. Аднак вучні з сельскай мясцовасці могуць пачаць паход з бліжэйшага да іх школы пункта маршруту.

У час падарожжа турысты наведаюць чатыры вёскі, дзе нарадзіліся Героі Савецкага Саюза – Кромавічы, Бераснёўка, Заляддзе, Беразіно. Акрамя таго, турысцкая група зможа больш даведацца пра такія слаўныя эпізоды Вялікай Айчыннай вайны, як разгром варожых гарнізонаў у Пустаселлі і Юхнаўцы, умовы пераходу 1-й Рускай нацыянальнай брыгады У.У.Гіль-Радыёнава на бок партызан. Не застануцца ў баку і трагічныя старонкі ваеннага ліхалецця: знішчэнне вёсак разам з насельніцтвам, барацьба падпольнай камсамольскай арганізацыі ў Глінным, гібель лётчыкаў – Г.К.Раманенкі і А.М.Панчанкі каля Вітуніч і Героя Савецкага Саюза І.С.Палявога ў Малажанах. Для больш поўнага даследавання фактаў можна арганізаваць сустрэчы з мясцовымі жыхарамі. Карыснай справай у час паходу стане правядзенне працоўнага або экалагічнага дэсанту.

Паход можна ажыццявіць як у летнія месяцы, так і на працягу ўсяго навучальнага года. Для гэтага прадугледжаны два варыянты начлегу.

Функцыі экскурсавода або гіда выконвае не толькі кіраўнік групы, але і самі ўдзельнікі паходу. Для гэтага кіраўніку перад пачаткам падарожжа неабходна пазнаёміць вучняў з матэрыяламі дадзенага метадычнага зборніка альбо рэкамендаваць для знаёмства матэрыялы з іншых крыніц.

# *Прыкладны парадак праходжання маршрута*

Падарожжа пачынаецца з горада Докшыцы. Аўтобусам “Докшыцы – Куты” у 5:45 турысцкая група даязджае да паварота на вёску Гняздзілава. Па асфальтаванай дарозе неабходна прайсці каля трох кіламетраў ва ўсходнім накірунку, каб трапіць у вёску. Перад самай вёскай Гняздзілава група перасячэ раку Мараі. У цэнтры вёскі, насупраць клуба, на ўшанаванне памяці 61 земляка – воіна і партызана, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1970 годзе пастаўлены помнік – скульптура воіна з аўтаматам.

*Гняздзілава 30 верасня 1943 года было спалена нямецка-фашысцкімі акупантамі. Такі ж лёс у ліпені 1943 года напаткаў і вёску Верацейка, якая знаходзіцца на поўдзень ад вёскі Гняздзілава і ужо амаль злілася з ёй. А тады немцы з 45 двароў Верацейкі спалілі 36.*

Ад Верацейкі неабходна накіравацца на паўднёвы ўсход. Каля трох кіламетраў група пройдзе па прыгожаму лесу, які складаецца з сасновых, яловых, бярозавых і асінавых парод дрэў. Выйшаўшы да маста неабходна перайсці раку Поня. Рухаючыся па правым беразе ракі ўніз па цячэнню група знойдзе помнік на магіле лётчыкаў Г.К.Раманенкі і А.М.Панчанкі, якія загінулі 29 чэрвеня 1941 года. Гэты помнік знаходзіцца ва ўрочышчы Калюга.

*Аднак мала хто ведае, што ў самалёце было тры чалавекі. Трэці быў стралок-радыст старшы сяржант П.К.Папоў. У час катастрофы ён цудам застаўся ў жывых. Вясной 1967 года ён прыязджаў у наш раён, каб пакланіцца праху сваіх баявых сяброў, паглядзець абеліск, наведаць Бягомль. Вось як ён успамінае тыя падзеі:*

*“Наш авіяполк з першага дня вайны пачаў баявыя дзеянні. 5 разоў вылятаў наш экіпаж на бамбардзіроўку варожых пазіцый.*

*І вось на шостым баявым вылеце не вярнулася наша машына. У пары з другім самалётам мы ляцелі ў разведку.*

*Трэба было выявіць варожыя мота- і механізаваныя часці і перадаць па радыё іх каардынаты. Неба кішэла нямецкімі знішчальнікамі. Прыйшлося ляцець “у прыцірку за зямлі”. Над Бягомльскім раёнам трапілі ў суцэльную нізкую воблачнасць. Я нечакана адчуў, што самалёт моцна ўстрасянула. Я стаяў у сваёй кабіне і ледзь не паваліўся. І ў тое ж імгненне ўбачыў пад самалётам лес. Паспеў толькі падумаць: “Вось і ўсё...”*

*... Я ляжаў на спіне галавой да матораў. Апрытомнеў ад нясцерпнай гарачыні, ад страшнага пякучага болю. Сабраўшы апошнія сілы, выпаўз з самалёта, скінуў камбінезон, які гарэў, і рукамі стаў тушыць агонь на штанах. Што было далей – не памятаю. Апрытомнеў у бальніцы ў Бягомлі ў той момант, калі па палатах расхаджвалі немцы. Ляжаў я пад выглядам пацярпеўшага мясцовага жыхара. Твар, рукі і ногі былі абпалены. На нагах – апёкі 3-й ступені. З рук злезлі ўсе пазногці, я сам не мог нават напіцца. З апёкамі ног 9 месяцаў праляжаў на спіне. Але*

*дзякуючы медработнікам, а асабліва ўрачу Я.П.Сырнікавай, я выжыў. Яна вельмі ўважліва адносілася да чырвонаармейцаў”.*

*У пачатку 1943 года, пасля таго, як варожы гарнізон у Бягомлі быў знішчаны партызанскай брыгадай “Жалязняк”, яго разам з іншымі раненымі чырвонаармейцамі і партызанамі адправілі самалётам на “Вялікую зямлю”. Пасля лячэння ў ваенным шпіталі камісія прызнала старшага сяржанта Папова непрыдатным па стану здароўʼя для далейшай службы ў авіяцыі і ў арміі наогул. З таго часу Пётр Папоў жыў у родным сяле Калікіна Арэнбургскай вобрасці ў Расіі. Да выхаду на пенсію працаваў сакратаром выканкома сельскага Савета.*

Рухаючыся далей на ўсход па цячэнню ракі, група выйдзе на дарогу Пруднікі – Бярозкі з паўднёвага боку вёскі Нябышына. Тут трэба павярнуць на поўдзень і прайсці каля двух кіламетраў па асфальтаванай дарозе да вёскі Вітунічы.

Каля будынка праўлення ДРУСП “Вітунічы” знаходзіцца помнік ахвярам фашызму, на ўсходняй ускраіне вёскі, за 100 м ад могілак знаходзіцца брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан.

Пасля экскурсіі па Вітунічах група аўтобусам “Докшыцы – Бярозкі” у 14:45 накіроўваецца ў вёску Кромавічы.



*У гэтай вёсцы 12 лютага 1917 года нарадзіўся Герой Савецкага Саюза Чэрныш Аляксандр Іванавіч. У 1935 годзе скончыў Марʼінагорскі сельгастэхнікум, а ў 1938 – прызваны ў Чырвоную Армію. У 1939 годзе ўдзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі. Потым быў накіраваны на Фінляндскі фронт. У Вялікую Айчынную вайну змагаўся на Ленінградскім, Закаўказскім, 1-м Беларускім франтах. Аляксандр Іванавіч вызначыўся пры вызваленні Беларусі 28 чэрвеня 1944 года каля г.п. Кіраўск Магілёўскай вобласці. Рота пад яго камандаваннем атакавала групу праціўніка, які наступаў, знішчыла 170, узяла ў палон 27 гітлераўцаў. На наступны дзень у раёне вёскі Панюшкевічы рота Чэрныша зайшла ў тыл ворага і перарэзала яму шлях да адступлення па дарозе Бабруйск – Мінск, адбіла 14 контратак танкаў і пяхоты, знішчыла 200 і ўзяла ў палон 80 гітлераўцаў. На жаль, у гэтым баі Аляксандр Іванавіч Чэрныш атрымаў раненне і загінуў. Званне Героя Савецкага Саюза яму было прысвоена пасмяротна 24 сакавіка 1945 года.*




У вёсцы Кромавічы, на доме, дзе жыў Чэрныш, устаноўлена мемарыяльная дошка. У гэтым доме жывуць родзічы праслаўленага земляка, пры сустрэчы з якімі можна больш даведацца пра жыццёвы шлях Аляксандра Іванавіча.

Каля дарогі на вёску Жамойск, на ўсходзе ад Кромавіч, група можа спыніцца на начлег. Пры неспрыяльных умовах надвор'я можна дамовіцца аб начлезе ў Бярозкаўскай сярэдняй школе. У цэнтры вёскі, каля будынка канторы мясцовага сельскагаспадарчага прадпрыемства размешчаны помнік Герою Савецкага Саюза Чэрнышу Аляксандру Іванавічу. Дарэчы, КУСГП носіць імя героя.



На наступны дзень турысты накіроўваюцца па гравійнай дарозе далей на ўсход у накірунку вёскі Жамойск.

Гэту вёску 25 мая 1943 года падчас правядзення карнай аперацыі "Котбус" нямецка-фашысцкія акупанты спалілі разам з 27 жыхарамі. У 1967 годзе на ўшанаванне памяці ахвяр фашызму пастаўлены абеліск.



*Жамойск*

Праз два кіламетры ад Жамойска знаходзіцца вёска Краснікі. Ад яе зусім блізка і вёска Вуглы, якая размясцілася побач з аўтадарогай Віцебск – Мінск.

*У гады Вялікай Айчыннай вайны ў Вуглах у хаце мясцовых жыхароў Зорыч Вольгі і Ярашэвіча Андрэя размяшчаўся партызанскі медсанбат. Санітарныя машыны падвозілі медыкаменты для партызан, а цяжкахворых адвозілі на Бягомльскі аэрадром, каб на самалётах адпраўляць іх у Цэнтральны шпіталь.*

З Вуглоў неабходна накіравацца на поўнач да вёскі Баяры. Да яе прыкладна чатыры кіламетры па лясістай мясцовасці.

*У гады Вялікай Айчыннай вайны ў Баярах начальнік медыцынскай службы брыгады "Жалязняк" урач Васілій Іванавіч Ляшчынскі разварнуў рухомы шпіталь. Сюды звозілі для адпраўкі за лінію фронту раненых з другіх абласцей і раёнаў.*



Ад Баяр група накіроўваецца на паўночны ўсход і праз чатыры ці пяць кіламетраў трапляе ў гарадскі пасёлак Бягомль. Тут можна зрабіць абзорную экскурсію па пасёлку, наведаць Бягомльскі музей народнай славы, пабываць каля самалёта, які знаходзіцца ў самым цэнтры пасёлка на перакрыжаванні аўтадарог Мінск – Віцебск і Барысаў – Глыбокае.



Ад Бягомля турысты бяруць накірунак на ноўнач. Праз кіламетраў пяць ці шэсць група выйдзе да вёскі Бераснёўка.



*Бераснёўка – радзіма Героя Савецкага Саюза Арсенція Гаўрылавіча Юхнаўца. Ён нарадзіўся ў 1916 годзе ў сялянскай сям'і. У 1938 годзе быў прызваны ў Чырвоную Армію, удзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі. У 1940 годзе стаў працаваць трактарыстам у Бягомльскай МТС. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў вадзіцелем, франтавым разведчыкам, артылерыстам. Удзельнічаў у абароне Масквы, у Курскай бітве, у вызваленні Беларусі і Польшчы. Памочнік камандзіра ўзвода старшына А.Г.Юхнавец вызначыўся ў баях пад Брэстам. 27 ліпеня 1944 года ён выявіў калону варожых аўтамашын і выклікаў агонь артылерыі на сябе. У выніку гэтага смелага ўчынку ўдалося знішчыць 30 аўтамашын з ваенным грузам і 150 гітлераўцаў. Загінуў Арсенцій Гаўрылавіч 20 жніўня 1944 года ў баях пад Варшавай. Пахаваны ў вёсцы Множ (Польшча). Званне Героя Савецкага Саюза было прысвоена 25 верасня 1944 года. За свае заслугі ў час баёў на Курскай дузе ў 1943 годзе быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Імем А.Г.Юхнаўца названы вуліца ў гарадскім пасёлку Бягомль і школа ў вёсцы Бераснёўка. На доме, дзе ён нарадзіўся, устаноўлена мемарыяльная дошка.*



У маі 1943 года ў час правядзення карнай экспедыцыі "Котбус" нямецка-фашысцкія акупанты спалілі вёску і загубілі 20 жыхароў.

Знаходзячыся ў Бераснёўцы, можна завітаць да Ларысы Дзмітрыеўны Глазко. Гэта дачка вядомай партызанкі, кіраўніка падпольнай камсамольскай арганізацыі, якая дзейнічала ў ваколіцах вёскі Гліннае, Ніканавай Аляксандры Андронаўны.

*Ларыса Дзмітрыеўна нарадзілася ў 1936 годзе. У 1943 годзе, калі ад рук фашыстаў загінула яе мама, дзяўчынцы было толькі 7 годзікаў. Яна тады мала што разумела, ведала толькі, што вайна – гэта вельмі страшна. З таго, што найбольш запомнілася – пастаяннае знікненне на некалькі дзён з дому мамы, потым яе з'яўленне, зноў адыход і г.д. А яшчэ – просьбы, забароны бабулі (бацькавай маці), каб Аляксандра не ўвязвалася ў гэту не жаночую справу, каб глядзела дзяцей (у Ларысы была яшчэ і малодшая сястрычка).*

*Куды знікала мама, дзяўчынка тады не ведала. Памятае толькі, што кожны раз, калі вярталася з задання, бабуля настойліва казала: "Ну, усё, больш не пойдзеш. А пойдзеш – бяры і дзяўчынку з сабой. Я глядзець больш дзіця не буду".*

*Праходзіў час, і падпольшчыца зноў адпраўлялася на заданне. А аднойчы ўзяла з сабой і Ларысу.*

*Ларыса Дзмітрыеўна ўспамінае: "Памятаю, як доўга ішлі невядомымі дарогамі. Ля пояса я была чымсьці абвязана. Гэта цяпер ведаю, што лістоўкамі. Аднойчы, ратуючыся ад бамбёшкі, сядзелі ў вадзе, а галовы ў кустах хавалі.*

*А вось дзень, калі маму арыштавалі, напэўна, не забуду ніколі. У хату найшло шмат немцаў. Мы адчулі – гэта канец. Усе плакалі: і бабуля і мы – дзеці. Не плакала толькі мама, як быццам бы ведала, што так і павінна было ўсё закончыцца. Як цяпер памятаю яе твар. Тады немцы забралі і маю цётку Ганну Навіцкую (бацькаву сястру). Больш я сваю маму не бачыла. Кожны дзень бабулю вазілі на допыт. Яна думала, што і яе расстраляюць, а таму, клапоцячыся пра нас з сястрой, гаварыла: "Як пачуеш, што мяне расстралялі, ідзі ў жыта, а адтуль – у Хмялеўшчыну, а потым у Шалагіры да цёткі Арыны".*

*На шчасце, бабуля мая засталася жывой. Але колькі ж, бедная, яна перанесла гора, жаху. Людзі адварочваліся ад нас, бо баяліся, што немцы могуць западозрыць іх за сувязь з партызанамі.*

*Але цяжэй за ўсё была невядомасць. Пра маму і цётку нічога не было чуваць. А потым адна жанчына сказала: "Алена, пабілі тваіх у Атрубку". З таго часу бабуля прыходзіла дадому вечарам уся мокрая: шукала целы дачкі і нявесткі (маёй мамы). Адзін вечар яе ўсё не было і не было. А калі прыйшла, то як толькі пераступіла парог, адразу і ссунулася ля сцяны.*

*Целы мамы і цёткі яна знайшла ў яме, якая была вырыта пад сцяной хлева. Загінулі юныя падпольшчыцы ад рук фашыстаў жудаснай смерцю. Іх мучылі, гвалтавалі, выразалі на целе зоркі і, нарэшце, расстралялі. Пахаваны яны ў вёсцы Шалагіры".*

У залежнасці ад надвор'я, пары года ці ўзроставага складу групы і яе фізічных магчымасцей начлег можна арганізаваць ў Бераснёўскай базавай школе ці ў лясным масіве каля вёскі Бераснёўка.

**З** Бераснёўкі трэба зрабіць невялікую "пятлю" да вёскі Заляддзе. Гэта каля двух кіламетраў.



*Заляддзе знакаміта тым, што ў гэтай вёсцы 28 мая 1894 года нарадзіўся будучы Герой Савецкага Саюза Перхаровіч Франц Іосіфавіч. У армію трапіў яшчэ ў 1915 годзе. Потым вучыўся ў Ваеннай акадэміі імя М.В.Фрунзе, скончыў курсы "Выстрал" у 1941 годзе. У гады грамадзянскай вайны быў палкавым ад'ютантам, памочнікам начальніка штаба брыгады. Пасля вайны камандзір асобнай роты, начальнік штаба стралковага палка, памочнік начальніка аддзела штаба і начальнік аддзялення ў штабе Маскоўскай ваеннай акругі. У 1939 – 41 гадах знаходзіўся на выкладчыцкай рабоце ў Маскве. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў на*

*Заходнім, Варонежскім, 1-м Украінскім, 1-м і 3-м Беларускіх франтах: камандзір стралковых палка, дывізіі, корпуса, камандуючы арміяй. Удзельнік абароны Масквы, вызвалення Украіны, Польшчы, Вісла-Одэрскай і Берлінскай аперацый. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 6 красавіка 1945 года за ажыццяўленне аперацыі па прарыву доўгатэрміновай абароны праціўніка і фарсіраванні Віслы. Пасля вайны знаходзіўся на камандных пасадах, да 1951 года начальнік упраўлення ўсеагульнага ваеннага навучання Галоўнага штаба Сухапутных войск. Памёр Франц Іосіфавіч 11 кастрычніка 1961 года.*

Пасля наведвання Заляддзя група зноў вяртаецца на аўтадарогу Бягомль – Беразіно і накіроўваецца на поўнач. Да самага Беразіно трэба будзе ісці па гравійнай дарозе, якая пралягае па прыгожаму лясному масіву ўздоўж заходняй мяжы Бярэзінскага біясфернага запаведніка. У хуткім часе турысты павінны выйсці на паўночную ўскраіну вёскі Улессе. Тут дарогу перасячэ рака Асовіна, якая з'яўляецца правым прытокам ракі Бярэзіна. У вёсцы Улессе, на мясцовых могілках, пастаўлена стэла.



*Тут пахаваны член Бягомльскай падпольнай партыйна-камсамольскай арганізацыі Хацкевіч Сяргей Сяргеевіч. Ён нарадзіўся ў гэтай жа вёсцы ў 1918 годзе. У гады вайны падпольшчык распаўсюджваў зводкі Саўінфармбюро, аказваў дапамогу партызанам атрада "Барацьба" харчаваннем. У чэрвені 1942 года схоплены гітлераўцамі і расстраляны.*

Прайшоўшы яшчэ каля кіламетра, з правага боку ад дарогі, турысты ўбачаць мемарыяльную дошку. Яна сведчыць аб тым, што ў гэтым месцы на досвітку 10 чэрвеня 1943 года прарвалі варожую блакаду і выйшлі з акружэння асноўныя сілы партызанскай брыгады "Жалязняк".



Ліпск

Праз тры кіламетры ад помніка група выйдзе да вёскі Ліпск. З поўдня вёску акаймляе рака Канчанка, а з поўначы – рака Гулянка. У цэнтры Ліпска знаходзіцца абеліск на ўшанаванне памяці 24 землякоў, якія загінулі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Ад Ліпска ідзе прамая дарога на вёску Беразіно. Гэта вёска багата сваёй гісторыяй. Паколькі Беразіно знаходзіцца на стратэгічным напрамку на дарозе Докшыцы – Лепель, тут у гады Вялікай Айчыннай вайны адбылося шмат падзей.

*Немцы двойчы палілі вёску. У чэрвені 1942 года са 176 двароў фашысты спалілі 170, пры гэтым загінула 7 мясцовых жыхароў. А ў*

*лістападзе 1942 года ў Беразіно некаторы час базіраваўся штаб партызанскай брыгады “Жалязняк”.*



*У пачатку мая 1943 года карнікі па-зверску замучылі і павесілі двух партызан – Завайчынскага Пятра Ягоравіча і Кульба Васіля Сцяпанавіча. Нягледзячы на забарону немцаў дапамагаць партызанам, гэтыя мужныя людзі прыносілі ім вопратку, прадукты харчавання, а то і самі ўдзельнічалі ў баявых аперацыях. Шыбеніцы немцы ўстанавілі на перакрыжаванні дарог Лепель – Докшыцы і Атрубак – Бягомль. Зараз на гэтым месцы стаіць помнік воінам і партызанам, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны. Мясцовыя жыхары пахавалі потым гэтых людзей на Беразінскіх могілках.*



Аднак вядома гэта мястэчка яшчэ і тым, што 13 мая 1905 года тут нарадзіўся Герой Савецкага Саюза Манковіч Сцяпан Сцяпанавіч.

*З 1929 года Манковіч знаходзіўся на савецкай і гаспадарчай рабоце. У 1939 годзе стаў сакратаром Бягомльскага райкома КП(б)Б. У ліпені 1941 года Манковіч па загаду ўрада быў пакінуты ў тыле ворага для арганізацыі падпольнай і партызанскай барацьбы. З сакавіка 1942 года партызаніў у навакольных лясах, а потым стаў камісарам партызанскай брыгады “Жалязняк”. Адначасова са жніўня 1942 года па снежань 1943 года з’яўляўся сакратаром Бягомльскага падпольнага райкома КП(б)Б. Пасля вайны ў 1946 годзе скончыў ВПШ пры ЦК ВКП(б). Працаваў на савецкай і партыйнай рабоце. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 2-й ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Памёр Сцяпан Сцяпанавіч Манковіч 18 красавіка 1978 года. Яго імем названы вуліца у Бягомлі і школа ў яго роднай вёсцы. Перад школай у 1982 годзе ўстаноўлены бюст.*



На начлег можна спыніцца ў ваколіцах вёскі Беразіно на правым беразе ракі Бярэзіна. Пры неспрыяльным надвор’і гэта можна зрабіць у Бярэзінскай сярэдняй школе.

**Н**а наступны дзень аўтобусам “Беразіно – Докшыцы” у 7:00 група пад’язджае да паварота на вёску Вольберавічы. Па шляху руху аўтобуса турысты праедуць праз вёскі Пустаселле і Гліннае. Кіраўнік можа коратка расказаць дзецям пра разгром варожага гарнізона ў Пустаселлі, якое адбылося 17 студзеня 1944 года. Яго здзейснілі партызаны Барысаўска-Бягомльскай партызанскай зоны. У ліпені 1943 года Пустаселле было спалена немцамі, пры гэтым загінула 13 чалавек. У цэнтры вёскі на ўшанаванне памяці 78 землякоў у 1969 годзе пастаўлены абеліск.



*Пустаселле*

Што датычыцца вёскі Гліннае, то тут кіраўнік можа засяродзіць увагу турыстаў на тым, што менавіта гэта месца было выбрана пад штаб 1-й Антыфашысцкай брыгады пад кіраўніцтвам У.У.Гіль-Радыёнава пасля таго, як брыгада перайшла на бок партызан. І менавіта тут быў распрацаваны план слаўнага пахода на Докшыцы і Круляўшчызну.




На будынку школы ў вёсцы ўстаноўлена мемарыяльная дошка на ўшанаванне памяці падпольнай камсамольскай групы пад кіраўніцтвам настаўніцы А.А.Ніканавай.

Турыстам неабходна прайсці яшчэ каля кіламетра па асфальтаванай дарозе, а потым павярнуць на поўнач у накірунку вёскі Тумілавічы. У чэрвен 1943 года і ў студзені 1944 года немцы двойчы палілі вёску. У цэнтры Тумілавіч знаходзіцца абеліск, які ўстаноўлены на ўшанаванне памяці 48 землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.



*Тумілавічы*

Каля Тумілавіцкай сярэдняй школы праходзіць асфальтаваная дарога на вёску Дзедзіна. Да яе каля трох кіламетраў. У Дзедзіна можна спыніцца каля драўлянай капліцы, якая знаходзіцца на вясковых могілках. Тут кіраўнік можа расказаць аб тым, як была спалена вёска. Да месца будуць і звесткі пра жорсткія баі, якія вялі партызаны ў ваколіцах Дзедзіна.

> *Так, восенню 1943 года асабліва цяжкія баі вяла брыгада імя ЦК КП(б)Б са спецыяльнымі нямецкімі карнымі атрадамі, якія знаходзіліся ў раёне. Сустрэўшы рашучы адпор народных мсціўцаў, фашысты ўводзілі ў дзеянне танкі, авіяцыю і артылерыю.*

Ад Дзедзіна турысцкая група павінна накіравацца на поўнач па насыпной пясчанай дарозе. Гэта дарога будзе пралягаць па балоце. Яе часта будуць перасякаць меліярацыйныя каналы. Праз два кіламетры турысты выйдуць да жалезабетоннага маста праз раку Бярэзіна. ***Тут трэба быць уважлівым!*** Неабходна павярнуць на ўсход і прайсці каля 200 метраў уніз па

цячэнню ракі. Група павінна выйсці зноў на насыпную дарогу. Яна з'яўляецца "галоўнай" і добра ўкатаная. Дарога будзе часта мяняць накірункі. Бывае, што амаль на процілеглыя. Абапал яе выкапаны меліярацыйныя каналы. Некалькі разоў ад дарогі будуць адгаліноўвацца ў балота іншыя шляхі – "выразаныя" трактарамі. У некаторых выпадках будзе здавацца, што вы заблудзіліся. Але групе неабходна будзе прытрымлівацца больш накатанай – "галоўнай". Такім чынам, турыстам трэба будзе прайсці каля дзесяці-дванаццаці кіламетраў. "Мяжой" гэтага вашага шляху будзе з'яўляцца "вузкакалейка". Па ёй раней вывозілі з балота торф на Круляўшчызненскі торфабрыкетны завод. Зараз яна не выкарыстоўваецца. За "вузкакалейкай" адразу адкрываецца від на вёску Кляпіцы.

Праз кіламетр палявая дарога выведзе вас ў цэнтр вёскі. Тут можна спыніцца на невялікі адпачынак. За гэты час кіраўнік можа расказаць пра знакамітага земляка, ураджэнца гэтай вёскі генерал-маёра ўнутранай службы, заслужанага супрацоўніка Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай Федэрацыі Леаніда Аляксандравіча Каротчыка.



*Ён нарадзіўся 5 ліпеня 1947 года. У 1968 годзе скончыў Свярдлоўскае пажарна-тэхнічнае вучылішча, а ў 1973 годзе Вышэйшую інжынерную пажарна-тэхнічную школу пры Акадэміі МУС СССР. У 1998 годзе скончыў курсы Акадэміі Дзяржаўнай службы пры Прэзідэнце Расіі. Прайшоў шлях ад начальніка каравула да начальніка Упраўлення дзяржаўнай пажарнай аховы горада Масквы. Узнагароджаны ордэнам Святога Данііла 2-й ступені, медалямі. Двойчы адзначаны імянной зброяй.*

Ад вёскі Кляпіцы неабходна ўзяць накірунак на паўднёвы захад, мінуць Малажанскі канал і ўвайсці ў вёску Малажане. Тут у гады Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ваенны аэрадром, на якім базіраваўся 132 авіяполк. Менавіта ў гэтым авіяпалку служыў Герой Савецкага Саюза Іван Сцяпанавіч Палявы



*Ён нарадзіўся ў 1907 годзе ў сяле Навамікалаеўка Наватроіцкага раёна Херсонскай вобласці (Украіна). У 1929 годзе яго прызвалі ў Чырвоную Армію. У 1933 годзе закончыў Ейскую ваенную школу пілотаў. У гады Вялікай Айчыннай вайны ваяваў на Паўднёвым, Калінінскім, Паўднёва-Заходнім, Ленінградскім, 3-м Беларускім і 1-м Прыбалтыйскім франтах. Здзейсніў 125 баявых вылетаў вядучым звяна, авіяэскадрыллі, палка на дальнюю стратэгічную разведку, бамбардзіроўку войск праціўніка. Але 20 жніўня 1944 года адбыўся яго апошні палёт. Лётчык Іван Сцяпанавіч Палявы, штурман Васіль*

*Мікітавіч Ніцай і паветраны стралок-радыст старшы сяржант С.А.Шумкоў – загінулі. У гэты дзень з малажанскага аэрадрома яны паляцелі ў Прыбалтыку бамбіць матэрыяльныя базы ворага на буйным чыгуначным вузле горада Мажэйкяй. Адбамбіліся, здавалася, удала. Уся станцыя была ў агні пажараў і ўзрываў. Але варожая зенітная артылерыя таксама вяла агонь па нашых “Ту-2”. Самалёт Палявога быў падбіты, ішоў на адным маторы. Да аэрадрома Палявы яго ўсё ж давёў, ды ў час пасадкі “Ту-2” рэзка пайшоў уніз і ўрэзаўся ў зямлю. Выратаваць экіпаж было немагчыма.*

*Інжынер па ўзбраенню 132 авіяпалка, ваенны таварыш Палявога І.М.Кубараў прысвяціў яму такія радкі:*

*Он был и строг и справедлив,*
*Его любили мы, как брата.*
*Он это знал и сам любил*
*И офицера, и солдата.*
*Он жизнь любил, и жить хотел,*
*Он был во всех делах примером.*
*В бою был храбр, отважен, смел –*
*Был настоящим офицером.*
*Неутомим, неудержим –*
*Шутил, когда все с ног валились.*
*Он был победой одержим,*
*Геройству все его дивились…*

*Экіпаж самалёта “Ту-2” пахаваны ў вёсцы Малажане на вясковых могілках. На магіле ўстаноўлены помнік.*



Ад вёскі Малажане бяром накірунак на захад і праз два кіламетры трапляем у вёску Слабада. Шлях будзе праходзіць каля царквы Святой Ганны. У 1925 годзе яна была зачынена, а ў 1967 годзе зруйнавана трактарамі да падмуркаў. Аднаўлена ў 1990-я гады і нанава асвечана 20 кастрычніка 1997 года.

Слабада – апошні пункт падарожжа. На аўтобусным прыпынку кіраўнік можа расказаць пра былога мясцовага святара Аляксандра Новіка.

*Па словах мясцовай жыхаркі Таісіі Аляксандраўны Таляронак – айцец Аляксандр Новік быў вельмі добразычлівы, ён хутка змог заваяваць любоў і давер сялян (Сям’я Новікаў прыехала ў Слабаду ў канцы 1930-х гадоў з Гродзеншчыны. У сям’і было шасцёра дзяцей). Памятаю, як гаварыла маці, што наведваліся партызаны і прасілі бацюшку стаць сувязным, сачыць за справамі на станцыі (нашы хаты тады стаялі побач). Падобна, што ён згадзіўся, бо потым госці з лесу перыядычна прыходзілі да яго, але не ў хату, а ў прызначанае месца. Зімой на сустрэчу ў балота вазіла яго мая маці.*

*Больш падрабязна тую трагедыю памятае дачка бацюшкі Нона Аляксандраўна Новік. У 1943 годзе ёй споўнілася 15 год. “Сувязь з партызанамі меў не толькі галава сям’і, але і адзін з сыноў – Алег, 1926 года нараджэння. Магчыма, што ён нават больш дапамагаў партызанам, чым бацька. Справа ў тым, што ў яго была схільнасць да вывучэння замежных моў, і, маючы за плячыма толькі школу, ён тым не менш добра размаўляў па-нямецку. Гэта ведалі немцы, і таму, як толькі прыязджалі ў вёску, адразу бралі хлопца за перакладчыка. Ён часцяком хадзіў на станцыю Крулеўшчына, і пасля гэтага адразу ў хату наведваўся нехта з партызан. Потым Алега запрасілі ў жандармерыю і прапанавалі ехаць вучыцца ў жандармскую школу. Абяцалі вялікую будучыню. Але бацька неяк адпрасіў сына, спасылаючыся на невядомую невылечную хваробу.*

*Бацьку разам з Алегам забралі адразу, як толькі згарэла хата. Гэта партызаны, каб адвесці падазрэнне і пагрозу ад іх жыцця, спалілі хату святара, але, папярэджаны, той вывез увесь скарб. Нехта бачыў, што рэчы дапамагалі выносіць партызаны, і данёс немцам. Разам з імі ўзялі і Юзіка Юнцэвіча, Валодзю Бурду. Бацюшку з сынам дапытваць пачалі тут жа, у вёсцы. Білі гумовымі шлангамі, зацісквалі пальцы ў дзверы. Перад ад’ездам у Докшыцы дазволілі выйсці да дзяцей з жонкай. Тата выйшаў да нас увесь сіні, так быў збіты. Мы кінуліся немцам у ногі, прасілі, плакалі, усё дарэмна. Тату загадалі зняць крыж, і усіх павезлі ў Докшыцы. Забіраў тату і іншых вяскоўцаў здраднік Комулька (пасля вайны яго знайшлі ў Польшчы). Маму забралі таксама і потым расстралялі разам з татам і Алегам. Зою і Ігара – нашых старэйшых – адправілі ў Германію, а нас з малодшым братам Севам партызаны схавалі на балоце”.*

Аўтобусам у 14:20 альбо 17:40 група можа выехаць да канечнага прыпынку – горада Докшыцы.



У Докшыцах пажадана наведаць музей Героя Савецкага Саюза Івана Сцяпанавіча Палявога, які знаходзіцца ў сярэдняй школе №1. Тут можна пазнаёміцца больш падрабязна з біяграфіяй, баявым шляхам героя. Экскурсаводы вам прапануюць цікавую экскурсію.





Імем І.С.Палявога ў горадзе названы плошча і адна з вуліц.

# *Прапануемы графік руху*

| Дзень | Участкі пераходаў | Адлегласць км | Спосаб руху |
|---|---|---|---|
| 1 | г. Докшыцы - в. Жары | 9 | аўтобус |
| | в. Жары - в. Гняздзілава | 3 | пешшу |
| | в. Гняздзілава - в. Нябышына | 10 | пешшу |
| | в. Нябышына - в. Вітунічы | 2 | пешшу |
| | в. Вітунічы - в.Кромавічы | 14 | аўтобус |
| 2 | в. Кромавічы - в. Жамойск | 4 | пешшу |
| | в. Жамойск - в. Краснікі | 2 | пешшу |
| | ст. Краснікі - в. Баяры | 8 | пешшу |
| | в. Баяры – г.п. Бягомль | 4 | пешшу |
| 3 | г.п. Бягомль - в. Бераснёўка | 6 | пешшу |
| | в. Бераснёўка - в. Ліпск | 10 | пешшу |
| | в. Ліпск – в. Беразіно | 6 | пешшу |
| 4 | в. Беразіно - в. Зарачыцк | 16 | аўтобус |
| | в. Зарачыцк - в. Тумілавічы | 5 | пешшу |
| | в. Тумілавічы - в. Дзедзіна | 3 | пешшу |
| | в. Дзедзіна - в. Кляпіцы | 11 | пешшу |
| | в. Кляпіцы - в. Слабада | 3 | пешшу |
| | в. Слабада - г. Докшыцы | 13 | аўтобус |

***Усяго актыўным спосабам руху – 77 км***

# *Карта-схема маршрута*




С

Ю

| | |
|---|---|
| → | Участкі пераходаў |
| → | Участкі пераездаў |
| △ | Месца начлегу |
| | Маштаб 1 : 200000 |

# *Помнікі Вялікай Айчыннай вайны*
# *па нітцы маршрута*

## в. Гняздзілава

### *Помнік землякам*

У цэнтры вёскі, насупраць клуба. На ўшанаванне памяці 61 земляка – воіна і партызана, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1970 годзе пастаўлены помнік – скульптура воіна з аўтаматам.

## в.Новае Запонне

### *Магіла савецкіх лётчыкаў*

За 2,5 км на ўсход ад вёскі, ва ўрочышчы Калюга, на правабярэжжы р.Поня. Пахаваны 2 лётчыкі – камандзір экіпажа, намеснік камандзіра эскадрыллі па палітчастцы лейтэнант Г.К.Раманенка і штурман малодшы лейтэнант А.М.Панчанка, якія загінулі 29 чэрвеня 1941 года. У 1966 годзе на магіле пастаўлены абеліск.

## в. Вітунічы

### *Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан*

На ўсходняй ускраіне вёскі, за 100 м ад могілак. Пахаваны 13 воінаў і 24 партызаны брыгады "Жалязняк", якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну.

У 1964 годзе на магіле пастаўлены помнік – скульптура воіна.

### *Помнік ахвярам фашызму*

У цэнтры вёскі, перад будынкам канторы ДРУСП "Вітунічы". На ўшанаванне памяці 124 аднавяскоўцаў, загубленых 30 мая 1943 года нямецка-фашысцкімі акупантамі, у 1967 годзе пастаўлена стэла.

## в. Жамойск

### *Помнік ахвярам фашызму*

25 мая 1943 года ў час правядзення карнай аперацыі "Котбус" гітлераўскія акупанты спалілі 27 жыхароў вёскі – дзяцей, жанчын, старых. У 1967 годзе на ўшанаванне памяці ахвяр фашызму пастаўлены абеліск.

## г.п. Бягомль

### *Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан*

Брацкая магіла знаходзіцца ў скверы каля дома культуры (вул. Савецкая). Пахаваны 73 воіны і 195 партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. Сярод пахаваных – воіны 277-й стралковай дывізіі 3-га Беларускага фронту, якая вызваляла Бягомль. У 1961 годзе на магіле пастаўлены помнік – скульптура партызана ў жалобе, абапал – 2 дошкі з імёнамі загінуўшых.

### *Мемарыяльная дошка падпольшчыкам*

Падпольная партыйна-камсамольская арганізацыя ў г.п.Бягомль была створана ў жніўні 1941 года пасля акупацыі пасёлка нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У яе склад увахodзілі камуністы Я.А.Шаўцоў (кіраўнік), Ф.А. Буланда, К.З.Патапейка, камсамольцы У.Г.Ганчар, браты М.А. і У.М.Печань, У.В.Таракан, С.С.Хацкевіч. Падпольшчыкі наладзілі сувязь з партызанамі, збіралі і перадавалі ім зброю, звесткі аб дыслакацыі і перамяшчэнні варожых войск, вялі палітычную работу сярод мясцовага насельніцтва. У 1942 годзе разам з партызанскай сувязной Н.І.Бычынскай былі схоплены фашыстамі і расстраляны. У 1979 годзе мемарыяльная дошка ўстаноўлена на будынку сярэдняй школы.

### *Партызанскі аэрадром*

Помнік знаходзіцца на паўднёва-заходняй ускраіне гарадскога пасёлка злева ад дарогі на Докшыцы. Тут у гады Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся партызанскі аэрадром. 20 снежня 1942 года партызаны брыгады “Жалязняк” разграмілі буйны нямецка-фашысцкі гарнізон у Бягомлі, авалодалі гарадскім пасёлкам і стварылі аэрадром, для чаго скарысталі ўзлётна-пасадачную паласу, будаўніцтва якой было распачата перад вайною. З красавіка 1943 года амаль штоноч двухматорныя самалёты ЛІ-2 101 авіяпалка далёкага дзеяння (камандзір Герой Савецкага Саюза В.С.Грызадубава) дастаўлялі для партызан Барысаўска-Бягомльскай партызанскай зоны і суседніх раёнаў Віцебскай і Вілейскай абласцей, а таксама Літвы зброю, узрыўчатку, боепрыпасы, медыкаменты, газеты, пісьмы, а на Вялікую зямлю адвозілі раненых, хворых, дзяцей, старых і жанчын. Была створана служба аэрадромнага абслугоўвання на чале з І.П.Вадзянковым. У красавіку 1943 года на партызанскі аэрадром прызямліліся буксіраваныя самалётамі планеры з групай літоўскіх патрыётаў – арганізатараў партызанскага руху ў Літве. У 1967 годзе на развілцы дарог на Докшыцы і Мінск на месцы партызанскага аэрадрома пастаўлены абеліск з самалётам на вяршыні.

### *Помнік ахвярам фашызму*

Знаходзіцца на вуліцы Савецкай, каля Дома культуры, у скверы. Пастаўлены ў 1975 годзе (скульптар Б.Івонцьеў, архітэктар В.Ткачоў) на ўшанаванне памяці 697 мірных жыхароў Бягомля, якіх закатавалі ці расстралялі нямецка-фашысцкія акупанты. Перад выцягнутай па гарызанталі стэлай з мемарыяльнай дошкай пастаўлена скульптура. Фігура параненага мужчыны пададзена ў рэзкім развароце, левая рука ўзнята ўгору, другая прыціснута да прастрэляных грудзей, галава закінута, твар скажоны гневам і болем. Мадэліроўка форм абагульненая. Скульптура ў вобразнай форме адлюстроўвае нязломнасць маральнага духу народа, яго гнеўны пратэст супраць няволі.

### *Помнік вызвалення*

Размешчаны на скрыжаванні дарог Мінск-Віцебск і Докшыцы-Барысаў. У Вялікую Айчынную вайну Бягомль быў цэнтрам Барысаўска-Бягомльскай

партызанскай зоны. Партызаны брыгады “Жалязняк” 20 снежня 1942 года разграмілі ў пасёлку гітлераўскі гарнізон і аднавілі савецкую ўладу. Гітлераўцы правялі некалькі карных аперацый, у час якіх партызаны былі вымушаны пакідаць населены пункт. Апошні раз гэта было 5 чэрвеня 1944 года.

30 чэрвеня 1944 года войскі 3-га Беларускага фронту (850-ы стралковы полк 277-й стралковай дывізіі і 7-я механізаваная брыгада) у ходзе Беларускай аперацыі фарсіравалі раку Беразіна і павялі наступленне на г.п.Бягомль. Пасёлак быў вызвалены пры ўдзеле партызан брыгады “Жалязняк”. У 1967 годзе ў гонар гэтай падзеі пастаўлена стэла.

### *Помнік землякам і ахвярам фашызму*

Размешчаны на вуліцы Кірава . Узведзены на ўшанаванне памяці 552 землякоў – воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, а таксама ахвяр фашызму, загубленых гітлераўцамі ў перыяд акупацыі раёна.

Пастаўлены ў 1969 годзе, скульптурная кампазіцыя – воін і партызанка.

### *Помнік партызанскай славы*

Помнік размешчаны каля перакрыжавання дарог Мінск - Віцебск і Бягомль – Барысаў. Пастаўлены ў гонар партызанскай аперацыі па разгрому варожага гарнізону ў Бягомлі (1942 г.)

Партызанскі рух на Бягомльшчыне разгарнуўся з першых дзён акупацыі раёна нямецка-фашыскімі захопнікамі. Партызанскі атрад “Рамана”, арганізаваны ў снежні 1941 года, у верасні 1942 года разгорнуты ў партызанскую брыгаду (з кастрычніка 1942 г. “Жалязняк”). Камандзіры Р.А.Дзякаў (верасень-кастрычнік 1942 г.), І.П.Ціткоў (кастрычнік1942 г. – ліпень 1944 г.); камісары С.С.Манковіч (верасень 1942 г. – снежань 1943 г.); Ф.І.Дзернушкоў (снежань 1943 – чэрвень 1944 г.). 20 снежня 1942 года народныя мсціўцы разграмілі ў Бягомлі буйны варожы гарнізон і авалодалі пасёлкам, які стаў цэнтрам Барысаўска-Бягомльскай партызанскай зоны. Тут дзейнічалі мясцовыя Саветы, працавалі школы, выдавалася газета “Савецкі патрыёт” – орган Бягомльскага падпольнага райкома КП(б)Б і партызанскай брыгады “Жалязняк”. Партызаны брыгады “Жалязняк” разграмілі гітлераўскія гарнізоны ў Докшыцах, Даўгінаве, на чыгуначных станцыях Параф’янава, Круляўшчызна, у вёсках Асавы, Будзілаўка, Юхнаўка, знішчылі і падарвалі больш за 5,5 тысяч чыгуначных рэек. Камандзіру партызанскай брыгады “Жалязняк” І.П.Ціткову і камісару С.С.Манковічу прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Помнік пастаўлены ў 1967 годзе (скульптар П.Белавусаў; бетон). Кампазіцыя пабудавана на кантрасным супастаўленні прамавугольнай стэлы (вышыня 3,2 м) і маналітнай глыбы, якія аб’яднаны агульным стылабатам. На фасаднай плоскасці стэлы рэльеф з выявай групы партызан са зброяй у руках. Іх рашучыя жэсты адлюстроўваюць веліч і нязломную сілу народа ў барацьбе з захопнікамі. На зрэзанай па вертыкалі плоскасці каменя памятны надпіс.

## в. Улессе

### *Магіла Хацкевіча С.С.*

Член Бягомльскай падпольнай партыйна-камсамольскай арганізацыі ў Вялікую Айчынную вайну Хацкевіч Сяргей Сяргеевіч нарадзіўся ў 1918 годзе ў в.Улессе ў сялянскай сям'і. Член ВЛКСМ з 1936 года. Скончыў 7 класаў сярэдняй школы. Працаваў сакратаром Бярэзінскага сельсавета. У вайну падпольшчык распаўсюджваў зводкі Саўінфармбюро, аказваў дапамогу партызанам атрада "Барацьба" харчаваннем. У чэрвені 1942 года схоплены гітлераўцамі і расстраляны. У 1978 годзе на магіле пастаўлена стэла.

## в. Ліпск

### *Помнік землякам*

На паўночнай ускраіне вёскі, злева ад дарогі на Бягомль. На ўшанаванне памяці 24 землякоў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1973 годзе пастаўлены абеліск.

### *Месца прарыву варожай блакады і выхаду з акружэння асноўных сіл партызанскай брыгады "Жалязняк"*

У 3 км на поўдзень ад вёскі знаходзіцца ўрочышча "Званок". У гэтым месцы на досвітку 10 чэрвеня 1943 года прарвалі варожую блакаду і выйшлі з акружэння асноўныя сілы партызанскай брыгады "Жалязняк". У 1982 годзе тут была пастаўлена мемарыяльная дошка.

## в. Беразіно

### *Помнік землякам*

У цэнтры вёскі каля дарогі ў 1968 годзе пастаўлена стэла на ўшанаванне памяці 67 землякоў, якія загінулі ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну.

### *Помнік партызанскай славы*

У цэнтры вёскі, на перакрыжаванні аўтадарог Докшыцы – Лепель і Бягомль – Беразіно. Установлены ў 1974 годзе ў гонар воінаў і партызан, якія загінулі ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

## в. Пустаселле

### *Помнік землякам*

На паўночна-заходняй ускраіне вёскі, каля дарогі на Беразіно. На ўшанаванне памяці 78 аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1969 годзе пастаўлены абеліск.

## в. Гліннае

### *Мемарыяльная дошка падпольшчыкам*

У 1942-43 гг. у вёсцы Гліннае дзейнічала падпольная камсамольская група. У яе ўваходзілі настаўніца А.А. Ніканава (кіраўнік), М.А. Гаўрыловіч, М.В. Дземідовіч, Г.Л. Навіцкая. Камсамольцы выкрывалі хлуслівасць

фашысцкай прапаганды, распаўсюджвалі сярод мясцовага насельніцтва звесткі пра сапраўднае становішча на фронце. У выніку палітычнай работы падпольшчыкаў у нямецка-фашысцкіх гарнізонах вёсак Гліннае, Пустаселле, Варлань 20 нямецкіх салдат перайшлі на бок партызан. Улетку 1943 года падпольшчыкі былі арыштаваны і закатаваны. У 1975 годзе на ўшанаванне памяці падпольшчыкаў на будынку школы ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

### *Помнік землякам*

За 200 метраў ад будынка канторы былога саўгаса “Камунар”, у скверы. На ўшанаванне памяці 52 воінаў і партызан – жыхароў вёсак Гліннае, Хмялёўшчына, Шалагіры, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1971 годзе пастаўлены абеліск.

## в. Тумілавічы

### *Помнік землякам*

У цэнтры вёскі на ўшанаванне памяці 48 землякоў – воінаў і партызан, якія загінулі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. Абеліск устаноўлены ў 1967 годзе.

# Літаратура


1. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск: БелЭн, 1996-2003.
2. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць – Мінск: Бел. Сав. Энцыклапедыя, 1985. – С.242 – 258.
3. Их именами названы…: Энциклопедический справочник. – Мінск: БелСЭ, 1987. – 711 с.
4. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1993-2003.
5. Газета “Родныя вытокі”. – 2008 – 2012.
6. Кулагін, А.М. Каталіцкія храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік /А.М. Кулагін – Мінск: БелЭн, 2000.
7. Кулагін, А.М. Праваслаўныя храмы на Беларусі: Энцыклапедычны даведнік / А.М.Кулагін – Мінск: БелЭн, 2001. – 328 с.
8. Легенды і паданні Докшыцкага краю. – Докшыцы, ЦДТ, 2001. – 68 с.
9. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Докшыцкага раёна: рэд.кал.: Г.П.Пашкоў і інш. – Мінск: БелЭН, 2004. – 752 с.
10. Шуневка. Мінск: Беларусь, 1985. – 32 с.


# Інфармацыйны рэсурс


1. http://dokshitsy.vitebsk-region.gov.by/ru/
2. https://ru.wikipedia.org/wiki/%C4%EE%EA%F8%E8%F6%EA%E8%E9_%F0%E0%E9%EE%ED
3. http://www.radzima.org/ru/photos_/dokshitskiy.html
4. http://www.radzima.net/ru/rayon/dokshycki.html
5. http://globus.tut.by/_regs/dokshic_tn.htm
6. http://westki.info/artykuly/11761/doksickiy-rayon-bielarus-doksicy-krulievshchina-biehoml-parafianovo-novosti-doksic